Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem.

№ 31 (60) Субота, 24-га верасьня 1927 г. м. Вільня Год II.

Беларускае слова

В... Цана нумару 20 грош.

Нацыяна... культурна-нацыянальная аутаномія.—Зямля сялянам на падставе уласнасьці.—Шырокі дэмакра... нальная царква.—Краевая згода.—Далучэньне Усходняй Беларусі да Заходняй.

Падпіс...
„ ...ал.
За... даражэй.

...дрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Wilno ul. Zawalna 6 m. 4
Рэдакцыя адчынена ад 12—2 гадз. штодня апрача сьвятаў.

Цана абвестак: На 1 старане —20 гр.
„ У тэксце . —40 гр.
„ На 4 старане —15 гр.
За кожны мілім. шырыны ў 1 шпальту.
Старана мае 8 шпальтаў.

Патрэба зьездаў радных.

Сяньня, калі ўжо аканчальна выясьніліся рэзультаты выбараў у месцовы Самаўрад — гмінныя рады і павятовыя соймікі, — можна сказаць, што справа беларускага адраджэньня ўступае у новую фазу: Народ наш праз сваіх выбарных — прадстаўнікоў атрымаў магчымасьць кіраваць гаспадарчым жыцьцём краю.

Праўда, няўсюды нажаль, мы маемо большасьць. Есьць мейсцы, дзе дзякуючы інэртнасьці масы беларускай, адсутнасьці сьвядомасьці нацыянальнай і важнасьці удзелу ў працы самаўрадаў — мы зьяўляемся у меншасьці. Але і гэта меншасьць мае магчымасьць *даць свой рашаючы голас* у справах, датыкаючых жыцьця сялянства. Затое у большасьці мейсцаў мы маем *большасьць у гмінных радах.*

І вось перад нашымі прадстаўнікамі стаіць шырокае поле дзеяльнасьці на ніве нашага нацыянальнага адраджэньня.

Нельга пытаньні гэтага адраджэньня зводзіць толькі да нейкіх палітычных заданьняў.

Народы адраджаюцца ня толькі праз палітычную сваю сьпеласьць, лік палітычных партыяў, ці палітычную працу.

Вайну 1870 г. выіграў нямецкі вучыцель, г. зн. нямецкая культура, нямецкая нацыянальная сьвядомасьць.

Незалежнасьць Польшчы, Чэхіі, Літвы, Латвіі і іншых народаў стварылі не іх палітычныя партыі, але іхняя нацыянальная культура ў шырокім сэнсі гэтага слова.

І нам, беларусам, нажаль да гэтага часу занадта распалітыкаваным і бачучым панацею ад усіх нашых балячак у палітыканстве, трэба ўрэшце зразумець, што аднэй палітыкай, *бяз культуры, без нацыянальнай сьвядомасьці* нічога дабіцца ня ўдасца.

Пакуль мы ясна, цьвёрда і пераконана не выявім сваё нацыянальнае аблічча, датуль мы будзем на палажэньні не народу, а люду, нейкай імглавіцы людской масы, служачай аб'ектам дэнацыяналізуючых нас экспэрымэнтаў.

І вось у сэнсі падняцьця нацыянальнай сьвядомасьці, нацыянальнай культуры — і могуць адыграць вялізарную ролю нашыя прадстаўнікі у Самаўрадах.

На першае мейсца тут выбіваецца пытаньне аб арганізацыі беларускага школьніцтва: усе школы, дзе вучыцца *большасьць дзяцей* беларускіх — павінны быць беларускімі. Далей ідзе пытаньне аб арганізацыі *людовых дамоў, бібліатэк — чыталень,* а пры віх, канешна, тэатраў і г. д.

Гашэньне ўсіх гэтых справаў належыць да кампэтэнцыі як раз *месцовых Самаўрадаў.*

Так сама да кампэтэнцыі гэтых Самаўрадаў належыць цэлы шэраг справаў іншага роду, але таксама характару культурнага: будова дарог, шосаў, бальніцаў, агранамічных пунктаў і г. д. Усе гэткія справы адносяцца да пытаньняў культуры у шырокім сэнсі гэтага слова.

І ад таго, як яны будуць вырашаны месцовымі Самаўрадамі, залежыць *ровень культурнасьці краю,* магчымасьці яго культурна-эканамічнага расквіту.

Канешна, кожныя з гэтых справаў паасобку можа і павінна быць вырашана згодна з чыста месцовымі, спэцыяльнымі, гэтак кажучы, варункамі. Аднак цэлы шэраг з іх павінен у вырашэньні сваім насіць пэўны *агульны прынцыповы характар.* Сюды у першую чаргу аднесьці трэба пытаньні *школьніцтва, дамоў людовых, бібліятэк, чытальняў,* а роўным чынам — прынцыповыя пытаньні, зьвязаныя з адбыцьцём павіннасьцяў.

Аб тым, што ўва ўсякай шырока грамадзкай працы неабходным зьяўляецца *супольны высілак, еднасьць кірункаў і высілкаў, арганізаванасьць і узаемнае падтрыманьне* німа чаго гаварыць. Гэтая ісьціна ўсім ведама.

Так сама ведама, што у імкненьні да самага зарэлізаваньня *сваіх нацыянальных патрэбаў,* мы спатыкаем шмат перашкодаў, якія можна перамагчы толькі *агульнай, аднalітай,* арганізавана і плянова праведзенай працай.

І вось сяньня, калі распачынаюць працу Самаўрады, якія маюць гэткія шырокія пэрспэктывы — узьнікае пытаньне *аб тактыцы* работы нашых беларускіх прадстаўнікоў у радах.

Канешна, няма і гутаркі аб нейкіх рэвалюцыйных ці апазыцыйна-нэгатыўных адносінах. З мамэнту прыняцьця абавязкаў раднага, кожны грамадзянін *павінен стаць на грунт* поўнай лёяльнасьці да Дзяржавы *і працу сваю вясьці выключна у межах істнуючых законаў.*

Але ў межах гэтых законаў ёсьць магчымасьці павесьці гэтую тактыку у працы у двох кірунках: *у кірунку абасобленай, асобнай для кожнай мейсцовасьці, нават гміны, і у кірунку скаардынаваных, узгодненых імкненьняў усіх радаў г. зв. Усходніх Крэсаў.*

Ясна, што ўсе высілкі паасобных радаў ня могуць мець таго значэньня і даць тыя вынікі, якія дасьць *агульны высілак усіх мейсцовых радаў.*

І дзеля гэтага ўсе радныя, усіх гмінных Самаўрадаў нашага краю павінны аб'еднаць сваю працу прынамсі у галіне школьніцтва і сьцісла культурных сваіх пачынаньняў.

Для поўнага выясьненьня нашых мейсцовых і агульнага значэньня патрэбаў, усе радныя павінны сабрацца, парадзіцца і устанавіць як мэтады заспакаеньня гэтых патрэбаў, так і аб мэтадах працы у самаўрадах наагул.

Выдзеляны выбарным Беларускім Нацыянальным Камітэтам Камітэт па справам самаўраду бярэ на сябе ініцыятыву зладзіць па паветах зьезды радных 'данага навету. Пасьля паветавых зьездаў — арганізаваны будзе *агульны* зьезд радных усей Заходняй Беларусі.

І вось Радныя — беларусы, у разуменьні неабходнасьці аб'еднаньня працы — накрэсьленьня пляну яе і устанаўленьня мэтадаў — павінны ўсе як адзін быць на гэтых зьездах. А для таго, каб праца зьездаў не была-б дарэмнай, трэ гатовіцца да іх загадзя, апрацоўваючы праэкт, выясьняючы патрэбы і г. д.

Мы думаем, што ўсе Радныя — беларусы зразумеюць усю важнасьць гэткага аб'еднаньня і супольнасьці мэтадаў працы і што у разуменьні гэтага яны як адзін прыймуць удзел у праэктаваных зьездах.

Гэтага вымагае дабро нашага Народу, ад гэтага залежыць нашая будучыня!

Яны у руках вашых Беларусы—Радныя!

Барацьба за беларускіх в йтау.

Перамога Беларускага Камітэту па Справам Гмінных Самаўрадаў.

КАМУНІКАТ.

Нз адбыўшыхся 17-га верасьня паноўных і ўжо апошніх выбарах войта Палачанскай гміны быў выбраны ізноў гр. МАЦЕЙ ПЯТРОВІЧ — справай якога пасьля ягонага арэшту занепакоіўся і ўзяў у свае рукі наш Камітэт.

Палітычны агляд.

Паход парыжскай прэсы проці Ракоўскага і Радавай Расеі ня спыняецца. Некатарыя з газэт, асабліва правых, проста жадаюць „выкінуць бальшавікоў за дзьверы" па прыкладу Англіі. Паход гэты проці бальшавікоў вельмі цікавы, як сымптом дырэктывы палітычнай самага ўраду. Рыхтуючыся да пэўных крокаў адносна Радавай Расеі, францускі урад хоча аперціся на апінію і запэўніць сабе патрыманьне з яе боку.

Але ў гэты паход уплуталіся і другія чыньнікі, не маючыя безпасрэдняй сувязі з дадзеным канфліктам. Справа ў тым, што

надходзіць у Францыі тэрмін новых парлямэнтскіх выбараў

і кожная з партыяў стараецца заваяваць сабе больш сымпатыяў выбаршчыкаў шляхам кампрамітацыі сваіх палітычным праціўнікаў. Папярэднія выбары 4 мая 1924 г., на якіх атрымалі перамогу сацыялістыя і радыкалы, адбываліся між іншымі пад лёзунгам направы адносінаў з Радаваю Расеяй. Нятрэба забываць, што каля $2^1/_2$ мільёнаў францускіх грамадзян трымаюць у сваіх руках вартасьцёвыя паперы расейскіх пазык і францускіх прамысловых прадпрыемстваў у Расеі, ануляваныя бальшавікамі Кожны з гэтых ранцье хацеў-бы хоць частку атрымаць з таго, што было ўложана ў Расеі. Сацыялістыя і асабліва радыкалы (Эррыё, Де-Монзі і іншыя) увесь час кармілі сваіх выбаршчыкаў надзеямі вырашэньня гэтай справы. З гэтай мэтаю быў прызнаны радавы урад, пачаты гандлёвыя перагаворы, якія некалькі разоў узнаўляліся, недаўшыя да гэтай пары ніякіх пазытыўных вынікаў Де-Монзі, які цяпер стаіць на чале францускай дэлегацыі, для францускіх перагавораў з бальшавікамі, асабіста езьдзіў да Масквы. Але з усіх гэтых пачынаў францускіх радыкалаў да гэтай пары нічога ня выйшла, апрача разчараваньня выбаршчыкаў і узмацненьня камуністычных антыдзяржаўных элемэнтаў. Вось цяперашні урад, у складзе якога ёсьць некалькі нацыяналістаў на чале з Пуанкарэ, і рашыў выкарыстаць канфлікт з Ракоўскім як таран проці быўшага левага блёку перад выбарамі па прыкладу таго, як у свой час англійскія консэрватары выкарысталі пісьмо Зіноўева да аглійскіх салдатаў і маракоў проці ураду Макданальда. Гэты манэўр даў Англійскім консэрватарам поўную перамогу. Францускія нацыяналісты пераканаты, што і ім пашанцуе гэтым спосабам зваліць сваіх праціўнікаў, даволі скампрамітаваўшых сябе радавою палітыкаю перад сваімі выбаршчыкамі. Вось дзеля чаго левая француская прэса выступае ў абароне Ракоўскага і стараецца з усіх высілкаў не дапусьціць да разрыву адносінаў з Масквою, да чаго імкнуцца правыя. Францускі ўрад яшчэ не заняў аканчальна сваёй пазыцыі ў гэтым пытаньні. Гэтага можна чакаць толькі пасьля прыезду Брыяна з Жэнэвы, голас якога мае у гэтай справе рашучае значэньне.

Не абыйшлося тут бяз уплыву і з боку Англіі. Дзякуючы неспыняючайся бальшавіцкай агітацыі яна страціла амаль усе азіяцкія рынкі, не гаворачы ўжо аб тым уроне, які прычыніла леташняя забастоўка чорнарабочых. Ад'емны балянс англійскага гандлю за апошнія гады дасягае некалькіх мільярдаў фунтаў штэрлінгаў. Апрача гэтага маральны аўгарытэт Англіі упаў. Вось дзеля чаго яна заняла рашуча-варожую пазыцыю у адносінах саветаў, прашкаджая ім на кожным кроку, дзе толькі можа. Перш-на-перш

прашкаджае бальшавікам атрымаць грашовую пазыку

ня толькі на ўласным грашовым рынку, але і наагул у Эўропе ці Амэрыцы, бо гэтыя грошы у першую чаргу пайшлі-бы на агітацыю проці яе ж. У апошні час варожы настрой Англіі яшчэ узмацніўся фліртам бальшавікоў з Амэрыкаю і амэрыканскімі нафтавымі каралямі. У гэтым англійскаму ўраду шмат памог англійскі нафтавы трэст з Дэтэрлінгам на чале, які з мільярднага даходу за 1926 г., дзякуючы манапольнаму гандлю, выдаваў значныя сумы на агітацыю проці саветаў. Але аднэй англійскай акцыі не выстарчае для барацьбы з саветамі, калі да гэтай акцыі ня будуць прыцягнуты іншыя эўрапэйскія дзяржавы, асабліва Нямеччына і Францыя. Адсюль упартае імкненьне Англіі да адарваньня апошніх ад саветаў, што часткова і удалося ўжо зрэалізаваць. А канфлікт з Ракоўскім у Парыжу нязьмерна аблягчыў гэту працу для Англіі, у той час як апошняя стаўка бальшавікоў на Францыю, Амэрыку і Кітай аказалася бітаю.

Адначасна

вельмі цікавыя зьмены адбыліся у складзе Рады Лігі Народаў у Жэнэве.

Малыя дзяржавы, уходзячыя ў склад Лігі Народаў, ужо даўно цяжацца гегемоніяй вялікіх дзяржаваў, асабліва Францыі, якая мае вялікі уплыў на Малую Антанту і Польшчу. Пакуль у Лізе ня было Нямеччыны, яны яшчэ цярпелі гэту гегемонію. Але апошняя увайшла да Лігі з выразнай мэтаю аб'еднаньня навокала сябе незадаволеных малых дзяржаваў і стварэньня новага антыфранцускага фронту ў Лізе Народаў. Першая спроба была зроблена ў мінуўшым годзе пры уступленьні Нямеччыны у Лігу Народаў, калі яна не хацела згадзіцца на прадастаўленьне Польшчы сталага мейсца у Радзе Лігі. Але гэта спроба не скончылась поўным пасьпехам. Польшча ў працівагу Нямеччыне ўвайшла ў склад Рады Лігі на мейсца гэтак званае поўсталое, гэта значыць, што праз тры гады яна можа быць перавыбрана зноў. Але тое, што здарылась цяпер у Радзе Лігі, ставіць гэту абецанку пад вялікі знак запытаньня. Гэткімі прыблізна правамі карысталася дасюль Бэльгія ў віду пашаны за тыя ахвяры, якія яна панясла ў часе прошлай вайны. Дзеля гэтага яна фактычна была дасюль нязьменяема. Цяпер як раз кончылася другое 3-х годзьдзе і нараўне з Чэха-Славакіяй і Сан-Сальвадарам былі пастаўлены на дзенным парадку перавыбары Бэльгіі. Перад галасаваньнем 38 дзяржаваў з агульнага ліку 48 прысутных на канфэрэнцыі запэўнілі яе, што пададуць галасы за яе. Але на галасаваньня аказалася, што толькі 29 падалі галасы і гэткім чынам Бэльгія была правалена, бо нехапіла 3-х галасоў. На места Бэльгіі, Чэха-Славакіі і С.-Сальвадара аказаліся выбранымі Фінляндыя, Канада і Куба. Гэта выразны фронт проці Францыі, якая заўсёды лічыла на падтрыманьне сябе галасамі Бэльгіі і Чэхаславакіі Хаця-ж Канады і Куба не варожа настроены проці Францыі, але ў кожным разе яна ня можа так рахаваць на іх, як на сваіх эўрапэйскіх хаўрусьніц, тым балей, што Амэрыканскія рэспублікі не зацікаўлены моцна ў эўропэйскіх справах. А што датычыцца Фінляндыі, дык яна вядзе гэткую асьцярожную і нэйтральную палітыку, што на актыўнае падтрыманьне з яе боку Францыя рахаваць ня можа. Нарэшце Фінляндыя вельмі шмат забавязана Нямеччыне за ўратаваньне яе у 1918 г. ад бальшавікоў і нямецкі уплыў у Фінляндыі дагэтуль вельмі вялікі. Гэты правал Бэльгіі вельмі навучальны для Польшчы, якая праз два гады гэтак сама павінна быць перавыбрана і можа апынуцца ў гэткім самым становішчы, калі не падрыхтуе адпаведнага грунту.

N.

Акдэз мітр. Еўлогія мітр. Сергію.

Мітрапалітам Еўлогіем адпраўлена ў Маскву наступнае афіцыяльнае пісьмо.

Яго Высокапрэасьвяшчэнству, Высокапрэасьвяшчэнаму Сергію, Мітрапаліту Ніжэгародзкаму, заступніку Местаблюсьціцеля Маскоўскага Патрыяршага Прэстолу.

Я атрымаў загады часовага Патрыяршага Сыноду № 97 ад 27 траўня аб сфармаваньні гэтага Сыноду, № 95 ад 1—14 ліпня па пытаньню аб загранічным духавенстве і сапраўдзіцельнае пісьмо В. Выс. № 96 ад тэй-жа даты.

Мне было вельмі важна пачуць голас усерасейскай царкоўнай улады і я спадзяюся, што ў блізкай будучыне яшчэ больш моцна і аўтарытэтна прагучыць голас усей Расейскай Царквы на Усерасейскім Памесным Саборы з удзелам усіх ерархаў — спаведнікаў, кліра і ўсяго Царкоўнага Расейскага народу.

Па пастаўленаму ў загадзе № 95 пытаньню аб загранічным расейскім духавенстве маю гонар далажыць В Выс. і часоваму Патрыяршаму Сыноду, што з самага пачатку маей царкоўна грамадзкай дзеялнасьці ў Зах. Эўропе ў грунце яе палажыў два кіруючыя пачаткі: першае — цясьнейшае неразрыўнае адз'нства з Маткаю Расейскаю Патрыяршаю Царквою, ўзглаўляемаю Сьвяцейшым патрыярхам Ціханам і ўзглаўляемаю цяпер яго законным правазаступнікам, і другое — скупленьне царкоўна-грамадзкай дзеяльнасьці выключна на рэлігійна маральным выхаваньні паствы з неўмяшацельствам Царквы ў палітычнае жыцьцё, прычым гэта апошняе дасягнута было мною шляхам доўгай і цяжкай барацьбы і цаною цяжкіх мукаў. Гэткі пункт гледжаньня я заўсёды праваздзіў і няўнікліва буду трымацца яго і у будучыне.

Што-ж датычыць маіх адносінаў да Радавай улады, дык мы, расейскія эмігранты, не знаходзімся у грамадзянстве саюзу С.С.Р.Р., ды і сам урад яго ня лічыць нас гэткімі, аб чым аб'яўлена ў асобным дэкрэце У адносінах да Радаваў улады мы знаходзімся у гэткім-жа становішчы, як праваслаўныя грамадзяне Літвы, Латвіі, Амэрыкі, Кітая і Японіі, якія, як і мы, належаць да адзінай Расейскай Праваслаўнай Царквы.

Па справядліваму ўказаньню В. Выс. Царкоўная ўлада ня можа нікому накідываць палітычных праграмаў, ці сьціскаць свабоду палітычных пераканаўньняў, і разнасьць дзяржаўнага грамадзянства ня можа перашкаджаць нам быць у лоне адзінай Маткі Расейскай Праваслаўнай Царквы. З другога боку і наша прыналежнасьць да Рас. Прав. Царквы ня можа служыць грунтам для прэд'яўленьня нам, эмігрантам, трэбаваньня „лёяльнасьці“, г. з. законапаслушнасьці ў адносінах Радавай улады, як гэта жаданьне, натуральна, прад'яўляецца да радавых грамадзян, ці да особаў, пражываючых на тэрыторыі радавай дзяржавы.

Аднак-жа, зьяўляючыся свабодным і незалежным у палітычным аднашэньні, загранічнае дыхавенства павінна ўсемерна шчадзіць сваю родную, змучыўшуюся Маці — Расейслую Царкву і ў сваей дзеяльнасьці ўсяляк ухіляцца ад таго, што магло-бы прычыніць ёй шкоду. Царква ёсьць хрысьціянскае сумленьне жыцьця і толькі строга рэлігійна-маральнае, чыста хрысьціянскае высьвятленьне яе праяваў складае задачу духавенства

І дзеля гэтага, ў пракананьні свайго аб вязку перад Маткаю — Царквою, ў імя маей безгранічнай любві да яе, я забавязуюся цьвёрда стаяць на злажыўшымся ўжо ў нас, згодна заветам Сьвяцейшага Патрыярха Ціхана, становішчы аб неўмяшацельстве Царквы ў палітычнае жыцьцё і не дапушчаць, каб у падлягаючых мне храмах амвон пераварачываўся ў палітычную трыбуну.

Я быў-бы вельмі шчасьлівы, калі-б гэта мая заява была прызнана здавальняючаю для Вас і састаячага пры Вас Патрыяршага Сыноду, бо нам, паўтараю, вельмі дорага кананічная еднасьць з Маткаю Расейскаю Царквою. Дзеля гэтага іменна я і дазволіў сабе ў даканчаньні горача прасіць В. Выс. не адрываць нас ад спасіцельнага лона нашай роднай Расейскай Царквы, з якою зьвязана ўсё наша жыцьце і цяпер і ў будучыне

Але, калі проці чаканьня, Вы не прызнаеце гэтай маёй заявы здавольняючай і будзеце прымушаны выключыць мяне і падлягаючае мне духавенства з складу Расейскай Царквы, дык што-ж рабіць, мы з пакораю прымем гэту новую, цяжэйшую спробу і тады благаславіце нас, згодна з ужо раней выражаным Вамі указаньні, на часовае незалежнае (аўтаномнае) істнаваньне у загранічных дзяржавах і на падпарадкаваньне мейсцовым Праваслаўным Царквам у праваслаўных дзяржавах.

У зьвязку з вышэйпададзеным і ў выкананьне 3 пар. загаду Сынода № 95 паведамляю Ваша Высокопр., што па адтрыманьні Вашага адказу на гэту маю заяву, я маю на ўвазе склікаць загранічнае царкоўнае сабраньне для акрэсьленьня далейшай арганізацыі Расейскай Праваслаўнай Царквы заграніцаю.

Просячы сьвятых малітваў Вашых, з глыбокаю пашанаю і братняю ў Хрысьце любоў'ю маю гонар быць Вашага Высока прэасьвяшчэнства.

Арыгінал падпісаў:
пакорнейшы слуга
Мітрапаліт *Еўлогі*

Парыж.
30 жніўня (12 верасьня) 1927 г.

Апошнія навіны.

З Польшчы.

Паседжаньне Сойму.

У панядзелак адкрылася першае паседжаньне Сойму. У пачатку аднагаласна была прынята прапазыка ўраду аб вызначэньні 25 мільёнаў зл. на запамогу для ахвяр паводкі ў Усх. Галіцыі. Затым пас Лібэрман (P. P. S.) выступіў з востраю крытыкаю прэсовага дэкрэту Прэзыдэнта Рэспублікі, як нарушаючага вольнасьць слова і нязгоднага з падставовымі пастановамі. Пасьля кароткай дыскусіі ўнёсак аб адхіленьні дэкрэту быў амаль аднагаласна прыняты. Пасьля было приступлена да трэцьцяга чытаньня закону аб самаўрадах. Жыды і нац. меньшасьці зрабілі абструкцыю і не дапусьцілі да трэцьцяга чытаньня, дзеля чаго яно было адложана да наступнага паседжаньня. Рад апазыцыйных клюбаў унёс шмат інтэрпэляцыяў, маючых прынцыповае значэньне. Гэтак Z. L. N. унёс дзьве інтэрпэляцыі. У першай жадае ухіленьня паўнамочча для ўраду ад 2 жніўня 1926 г. У другой разам з клюбамі Ch. N., Ch. D. і часткаю Пяста жадае зьмены канстытуцыі ў тым сэнсі, каб выдзяліць пэўныя справы з компэтэнцыі Прэзыдэнта Рэспублі- ў часе між соймавымі сэсіямі. Абедзьві гэтыя інтэрпэляцыі адасланы да констытуцыйнай камісіі. Затым клюбы Z. L. N. і Ch. N. унясьлі ўнёсак у справе вотума недаверра для міністра асьветы Дабруцкага, а клюбы Z. L. N., Ch. D,. Ch. N., Пяст і N. P. R. інтэрпэляцыю да міністра асьветы Дабруцкага, жадаючы між іншым адмены загаду аб ужываньні ўкраінскай мовы ў сярэдніх школах, загаду, які павінен быў быць распаўсюджаны і на пачатковыя школы ў Усх. Галіцыі.

АДКЛАД НАДЗВЫЧАЙНАЙ СЭСІІ СОЙМУ.

У аўторак паседжаньне сойму распачался 3 г. 15 м. пасьля палудня. На ўрадавых лавах заняли мейсца віцэ-прээзс рады міністраў Бартэль, мін. унутраных справаў гэн. Складкоўскі, мін. почт і тэл. Медзінскі, мін. зям. рэформаў Станевіч і некалькі віцэміністраў. Перад дзенным парадкам пажадаў голасу віцэ-прэм'ер Бартэль і прачытаў наступнае распараджэньне Прэзыдэнта Рэспублікі ў справе адкладу надзвычайнай сэсіі Сойму:

„На па ставе 25 арт. Констытуцыі адкладаю з дня 20 верасьня 1927 г. надзвычайную сэсію Сойма на 30 дзён. Варшава, 20 верасьня 1927 г. Прэзыдэнт Рэспублікі (—) Масьціцкі, Старшыня Рады Міністраў (—) І. Пілсудзкі“

Пасьля адчытаньня вышэйшага распараджэньня на пасольскіх лавах паднялася агульнае абурэньне У віду распараджэньня Прэзыдэнта Рэспублікі, адкладываючага сэсію, маршалак Ратай а 15 гадзіне 19 мін. замкнуў паседжаньне Сойму.

АДКЛАД СЭСІІ СЭНАТУ.

Пасьля адклада сэсіі Сойму Прэзыдэнт Рэспуллікі падпісаў дэкрэт аб адкладзе сэсіі Сэнату. Маршалак сэнату Тромпчынскі пасьля размовы з прадстаўнікамі клюбаў рашыў падаць Прэзыдэнту пісьмо з протэстам.

НАРАДА ў ПАЛАЦУ.

У аўторак раніцаю адбылася ў Палацу конфэрэнцыя, ў якой прынялі ўдзел Прэзыдэнт Рэспублікі, Маршалак Пілсудзкі і віцэ прэм'ер Бартэль Тэмаю конфэрэнцыі была палітычная сытуацыя і ўстанаўленьне адносінаў ураду да Сойму. У выніку конфэрэнцыі было пастаноўлена адлажыць сэсію Сойма.

ЗАПЫТАНЬНЕ ў СПРАВЕ ГЭН. ЗАГУРСКАГА.

Партыі Z. L. N., Ch. N., Ch. D., Piast і N. P. R. унясьлі Маршалку сойму запытаньне ў справе зьнікненьні гэн. У. Загурскага. Інтэрпэлянты пытаюць у ваеннага міністра і міністра юстыцыі, у якім палажэньні знаходзіцца следзтва ў гэтай справе, і дзеля чаго да гэтуль ня выдана афіцыяльнага камунікату, хто загадаў звольніць гэн. Загурскага з турмы на Антокалі ў Вільні, хто эскартаваў яго з Вільні, па чыйму загаду быў звольнены ў Варшаве і хто нясе адказнасьць за зьнікненьне?

З ЗАГРАНІЦЫ.

Выбары да Рады Лігі Народаў.

Дзеля таго, што скончыўся тэрмін мандатаў часовых сябраў Рады Лігі Народаў Бэльгіі Чэха-Славакіі і Сан-Сальвадара на цяперашняй сэсіі Лігі Народаў і у Жэнэве адбыліся перавыбары, ў выніку якіх былі выбраны Фінляндыя, Канада і Куба. Вынікі гэтых перавыбараў лічацца як паражэньне вялікіх дзяржаваў, асабліва Францыі. Бэльгія была сябрам Рады Лігі з самага пачатку істнаваньня Лігі. Як Бэльгія, гэтак сама і Чэха-Славакія былі прыхільнікамі Францыі. Немцы вельмі задаволены вынікамі гэтых перавыбараў.

З ЛІГІ НАРОДАЎ.

Прыняты польскі праэкт, прапануючы ўрачысты асуд наступацельнай вайны і выкарыстаньне мірных сродкаў для вырашэньня ўсялякіх міжнарадовых канфліктаў.

ВЭНГЭРСКА-РУМЫНСКІ КАНФЛІКТ.

Камітэт трох праўнікаў разглядаў вэнгэрска-румынскі канфлікт, аднак не дайшоў да канкрэтнага выніку. Пасьля гэтага сабралася Рада Лігі на тайнае паседжаньне па гэтаму пытаньню. Прадстаўнік Румыніі Цітулеску заявіў, што, калі-б ня былі ўвгледняны жаданьня Румыніі, дык яна мусіла-бы заплаціць вэнгэрскім аптантам больш 400 мільёнаў фр. у золаце.

АСУД ТАЎРОГЭНСКІХ ПАЎСТАНЦАЎ.

Ваенны суд у Таўрогэне разглядаў справу 22 учасьнікаў апошняга паўстаньня. Суд асудзіў: 5 — на сьмяротную казьнь, 9 — на дажывотную цяжкую турму, 1 — на 20 гадоў цяжкай турмы, 1 — на 14 г. цяжкай турмы, 1—на 10 г. цяжкай турмы, 1—на 3 г. і справа аднаго адложана. Асуджаныя падалі прэзыдэнту просьбу аб літасьці. Прэзыдэнт замяніў 7 з іх сьмяротную казьнь дажывотнаю цяжкаю турмою. Маемасьць асуджаных канфіскавана на карысьць дзяржавы.

НЯЎДАЛЫ ЗАМАХ НА АРТЫЛЕРЫЙСКІЯ СКЛАДЫ ў КОЎНЕ.

У суботу 17 г. м. быў зроблены замах на цэнтральныя артылерыйскія склады ў Коўне. Замахаўцы хацелі ўзарваць склады ваенных прыладаў. Замах ня ўдаўся. Між ваеннымі патрулямі і замахаўцамі завязалася перастрэлка Некалькі замахаўцаў удалося злавіць.

АБ'ЕДНАНЬНЕ УРАДАЎ ХАНЬКОЎ І НАНКІНА.

Паводле вестак, атрыманых з Кітая, конфэрэнцыя прадстаўнікоў Ханькоў і Нанкіна закончылася аб'еднаньнем урадаў гэтых двох ламрневых правінцыяў. Пакуль нічога невядома аб стварэньні якога небудзь агульнага ўраду.

ДЖОН Д. РОКФЭЛЕР.



Сын амэрыканскага мільярдэра Рокфэлера ахвяраваў 10 мільёнаў даляраў на арганізаваньне бібліятэкі Лігі Народаў. Сума гэта дазволіць выбудаваць спэцыяльны гмах і купіць столькі твораў па сацыялёгі і праву, што гэта будзе найлепшая навуковая бібліятэка ў Эўропе.

Скуткі красамоўства

Ад самай раніцы ужо натаўп публікі грудзіўся у салі і на калідорах N-скага Акружнага Суду.

У гэты дзень разьбіралася справа нейкага Швемона Закавыкі, аб якім усе мейсцовыя газэты пісалі амаль ня поўгода. Па газэтным рэляцыям выходзіла, што гэта зусім легэндарны зладзей: дзясяткі розных самых агідных машэнстваў і крадзежаў, якія апошнія год — два будэрыжылі грамадзкую апінію горада — прыпісвалася Закавыцэ. Ён нічым ня брэзгаваў: краў і абжуліваў ня толькі багачоў, але на'т у беднякоў не уздрыгаўся сьцягнуць апошняе з дабытку.

Зразумела тады, што кожны жыхар жадаў папасьці на разбор гэткай сэнсацыйнай справы.

Апрыч таго — агульнае зацікаўленьне яшчэ больш было узьнята тым, што бараніць гэткага зладзея узяўся знамяніты ува усім краі адвакат Златавуснаў.

Кожны цікавы быў, як гэта будзе бараніць гэткага заядлага зладзея вялікі красамоўца і які вынік будзе з гэтай абароны?

—..—

Прад судом прайшоў цэлы шэрэг сьведкаў. Аднак з іх паказаньняў ніяк нельга была цьвёрда устанавіць, што усе тыя крадзежы, апуканства і інш. злачынствы выкачаў іменна Закавыка, а не нехта іншы.

Адна толькі старэнькая бабулька, у якой бязсумленны злодзей украў апошні кажушок, дзякуючы чаму яна усю зіму абходзілася бяз цёплай адзежыны,—пырхаючы дый відавочна знарок кашляючы, каб даць доказ сваім словам, што яна захварэла з прычыны пакражы яе кажуха, – на пытаньне суду:

— Хто-ж па вашаму абакраў вас?

— Дый вось ён, гад, каб яму ні дна ні пакрышкі – ткнула у бок абвінавачанага.

— Чым-жа вы сьцьвярджаеце гэта? задаў старой пытаньне адвакат:

— Ды хто ж болей? Ен! Вядомы усім злодзей! тонам пракананьня адказала старая.

Іншыя сьведкі на пытаньне: – хто пакраў? адказвалі:

— Хто яго ведае; шмат іх цяперака разьвялося. Я за руку не злавіў... Кажуць, што абвінавачаны Мо' і ён...

Сам абвінавачаны катэгарычна цьвердзіў:

— Знаць ня знаю, ведаць ня ведаю! Дадушы, вось каб так заўтра не дачакаў — ня браў, ня краў, не абманваў. Напрасна на мяне...

Паліцыя цьвердзіла, што арыштавала Закавыку, бо быў падазроны: нічым не займаўся, бадзяўся па гораду, часта—густа піў. Няма ведама адкуль браў грошы. Што нічога не знайшлі пры вобыску — ня дзівота! надта спрытны хлапец дый сямейка уся—як адзін...

Словам да концa паседжаньня амаль ня кожны у салі ужо інакш пазіраў на абвінавачанага.

— А мо і запраўды абмылка? думалі у публіцы.

Адвакат аж зіяў увесь. Ен ужо з кепска-маскаваным трыумфам пазіраў на пракурора быццам кажучы:

— А нутка? пакажыся толькі! Я ця раздзелаю! пад гарэх выйдзеш!

Аднак пракурор не траціў анімушу: пільна нешта аднатоўваў алавіком, уважліва прыслухоўваўся да таго, што казалі сьведкі.

—..—

— Сьледзтва судовае закончана. Слова мае пан пракуратор! абвясьціў старшыня Суду.

Пракурор уздрыгануў, падняўся. Абвёў вачыма салю, даўжэй затрымаў ўзор на абвінавачаным і цьвёрда пачаў

Прад вамі, паны Судзьдзі, прайшоў цэлы шэрэг пакрыўджаных. Каго тут толькі ня было! Можна сказаць няма клясы няма грамадзкае групы, якой бы ня ткнула рука бязсумленнага грамілы. Ен, бы зараза нейкая у працягу некалькі год жывіўся чужым дабром, жыў на рахунак чужой працы. Вы бачылі тут і заможных і бедакоў. Аднолькава усім даўся у знакі злодзей. У яго сэрцы не знайшлося літасьці на'т да старой ўдавы, якой ён забраў апошні кажух і тым вагнаў яе у хваробу. Вы чулі кашэль і хрыпоту старой? Гэта яго рук справа! Для гэткіх зладзеяў няма словаў: міласэрнасьць. Ен павінен панясьці найвышэйшую кару, якая предугледжана законам.

Хто ж такі гэты зьвер у вобразе чалавека? Хто заместа сэрца — носіць у сваіх грудзех вырадка чалавечага зьмяінае жала? Паны! Мы мала маем простых доказаў проці абвінавачанага.

Але успомніце старую лацінскую пагаворку: Vox populi, vox Dei! — Але! Голас народу, гэта голас Бога! А гэты голас аб'явіўся у словах няшчаснай ababранай старухі, якая у сваім горы вінаваціць толькі абвінавачанага. Гэты голас гудзіць у паказаньнях паліцыянтаў, якія вычулі яго у гаворцы і апініі агулу... А калі вам мала гэтага, калі ёсьць яшчэ нейкія сумленьні — зірніце на абвінавачага і прызавіце на помач навуку. Школа Ламброзо, яко прынцыпы і меркі прылажыце да абвінавачанага. Гыты нізкі, абросшы валасамі лоб, зьцяты верх галавы, гыты шмыгаючыя беспакойна вочы, гэты сплюснуты нос.. А вугал лоба і лініі роту? Гэтаж ж тыповы абразец праступніка бяз сумленьня і сэрца... І вось, калі да голасу народу вы далучыце навуковы досьлед, — я ні мінуту не сумлеваюся — што вы, паны, сваім суровым прыгаворам пазбавіце грамадзянства ад небясьпечнага праступніка — зьвера, які пэўне-ж не застановіцца і перад праліцьцем крыві. Паны! Справядлівасьць, закон, узбударажэнае і пад пагрозай небясьпекі стоючае грамадзянства чакае ад вас суровага прыгавора абвінавачанаму.

Раяшнік.

(Крыху палітыкі і „раяшнай“ крытыкі)

Вось Ярэміч пасол, дык ужо не зявае — да „начальства“ ўсё залезае і падаў мэмар'ялаў аж тры!...

Ах чорт-жа яго падзяры?!...

Аздаравіць сам „Крэсы“ маніцца, ну якжа нам тут ня дзівіцца, што Ярэміч пасол — павадыр „Сель.-Саюзу“ — ні на Марзэ, ці на Юзу, а на звычайнай машынцы друкаваны, паде гэтак званы —

Мэмар'ял...

Вось дзе „Саюзу“ „скандал“?!

Што павадыр іх імкнецца, ну... як гэта завецца — прыхільна, а нават і пільна ўсіх іншую працу спыніць і...сам „Крэсы“ аздаравіць...

На-тка?! Ці пройдзе ўсё гладка?!...

Каб за такое заданьне ўжо брацца, трэба нарэшце і з вёскаю знацца, трэба штоколячы тамака мець, каб у імя народу гудзець...

А сідзячы дома... Ах, ты Ярома?!...

Пакінь у дзьверы „начальства“ ламацца— аб новым мандату старацца, бо на „Крэсыю“— не атрымаеш ужо ты канцэсыю...

Гэтак і знай і... здароў бывай!...

——..——

А Косьцевіч Макар, палазіўшы ўлева і ўправа — глядзіць: кепская справа — пісакаў за надта ўжо разьвялося і працы зусім не знайшлося.

І хоцькі ня хоцькі сьмірыўся—з „Беларускім Днём“ пагадзіўся... Бо на Мамоньку калі спадзевацца — без парткаў можна застацца.

——..——

А вось яшчэ крыху аб справах Палачанскіх — аб радных нашых сялянскіх.

Пасьля рожных зьнявагаў і передрагаў нарэшце ўжо войтаўскі крызыс мінуўся і войтам ізноў апынуўся — Пятровіч, знаёмы наш радны...

Хай будзе-ж цяпер ён уважны і ў згодзе з законам працуе — тады ў лёсе яму пашанцуе. Бо справа ўся гэта, хоць перамога ёсьць Камітэта, а для другога выпадка — ня пройдзе так гладка...

Трымайся! — На радных усіх аглядайся, дый памятай, што еднасьць усё зможа і ўсё пераможа.

Шэйнэ-Катарынка

ПАХОД ПРОЦІ ФРАНЦЫІ.

З Масквы паведамляюць, што кіраўнік прэсы пры бэрлінскім савецкім пасольстве Міронаў атрымаў загад сабраць камуністычных нямецкіх і заграннічных журналістаў, знаходзячыхся ў Бэрліне і паведаміць іх, што радавая ўлада і III інтэрнацыянал пастанавілі зьмявіць палітыку ў адносінах Францыі, якая ўвесь час імкнецца да зблі жэньня з Англіяй і што цяпер неабходна пачаць на цэлым сьвеце паход проці францускіх „імпэрыялістаў і мілітарыстаў“.

ЦІКАВЫЯ ДАКУМЭНТЫ.

Пасьля 4-х месячнай упартай працы цэлага штата тлумачоў і іншых служачых пэкінскімі уладамі закончана тлумачэньне дакумэнтаў і матэр'ялаў, узятых пры вобыску у радавым пасольстве. Ператлумачаныя на кітайскую мову гэтыя дакумэнты злажылі 42 тамы Англійскае выданьне будзе складацца з 2-х тамоў. Яно будзе распаўсюджана па ўсяму сьвету з мэтаю паінфармаваньня б дзейнасьці бальшавікоў у Кітаі.
а

КАТЭГАРЫЧНЫЯ ВАРУНКІ ФРАНЦЫІ.

Францускі пасланнік у Маскве Гэрбэт наведаў Чычэрына і заявіў яму па даручэньню свайго ўраду, што Францыя можа распачаць перагаворы аб дагаворы ненападзеньня толькі ў тым выпадку, калі будзе адозван з свайго становішча Ракоўскі, саветы ня будуць мешацца ў унутранія справы Францыі і выступяць з вызнай прапазыкаю ў справе ўрэгуляваньня, расейскіх даўгоў.

РАКОУСКІ — НЯМЕЦКІ ШПІЕН.

Француская газ. „Лібэртэ“ зьмяшчае цікавыя дакумэнты. з якіх вынікае, што цяперашні савецкі пасланнік у Парыжу Ракоўскі ў часе рэвалюцыі быў на нямецкай шпіёнскай службе пад кіраўніцтвам начальніка нямецкай разьведкі ў расейскай арміі Фэйербэнда. Дакуманты гэтыя ўзяты з архіву Злучаных Штатаў.

Стыхійныя бедствы.

Над палуднёвымі вастравамі Японіі пранеслася страшэнная бура (тайфун). У працягу 2 гадзін вастр вы былі заліты вадою. Зьнішчаны м. Накамуры, Коймы і Нагасакі. Зьгінула больш 3,000 чалавек. Больш 100,000 знаходзіцца бяз даху над галавою. Вышыня хвалі дасягала 3 мэтраў. 500 параходаў сарвава з якара і ўнесяны ў мора. Гэтак сама прайшоў тайфун і над Мэксыкаю. Разбурана шмат местоў. Зьгінула некалькі тысячаў асобаў. Тэлеграфная, тэлефонная і ж. д. камунікацыя спынены. Вялікія тэрэны зямлі знаходзяцца пад вадою. А ў палудневай Расеі— Крыму і на Каўказе адчувалася моцнае землетрасеньне, пацягнуўшае за сабою вялікія матэр'яльныя ахвяры і ў людзях. Асабліва моцнае землетрасеньне адчувалася ў Севастопалі, Ялце, Сымфэропалі, Наварасійску і Батуме. Разбурана шмат дамоў. 16 асобаў зьгінула і некалькі соцен раненых. Землетрасеньне адчувалася і на Украіне, дасягаючы да Кіява і нават да Роўна на польскай тэрыторыі. Апошні раз землетрасеньне ў Роўным адчувалася у 1903 г., але значна слабейшае. А у цэлым радзе Штатаў Паўночнай Амэрыцы стаіць небывалая жара. Закрыты школы. Ёсьць людзкія ахвяры соўнечных udараў.

НОВАЕ ЗЕМЛЕТРАСЕНЬНЕ ў КРЫМУ.

З Адэсы паведамляюць аб новым землетрасеньні ў Крыму. Затанула 40 вялікіх рыбацкіх лодак, знахадзіўшыхся ў адкрытым моры і 2 параходы Ёсьць шмат ахвяраў у людзях.

ПАСЬЛЯ ТАЙФУНА — МАРСКОЕ ЗЕМЛЕТРАСЕНЬНЕ.

Пасьля тайфуна палуднёвую Японію наведала землетрасеньне, выклікаўшае гэткую страшную марскую буру, што затанула каля 150 параходаў. Лічба ахвяраў перавышае 400. Затануў параход з 900 пасажырамі па дарозе між Токіо і Камчаткай. 114 рыбацкіх параходаў затанула каля Амакуса. Зьгінула 70 рыбакоў. Агульны лік ахвяраў тайфуна і землетрасеньня дасягае 5.000 асобаў.

ПАЖАРЫ.

Паводле бальшавіцкіх статыстычных даных у працягу апошніх 10 месяцаў на тэрэні Усх. Бел. было 3,352 пажары, з якіх 237 фабрычных прадпрыемстваў.

ПРОБНАЯ МАБІЛІЗАЦЫЯ У ГОМЕЛЬСКІМ ВОКРУГУ.

17 верасьня ў Гомельскім вокругу была аб'яўлена пробная мабілізацыя. У 5 гадз. рана места прачнулася ад сыгналаў комсамольцаў і партыйных арганізацыяў. Пачалі з'язжацца сотні сялянскіх падводаў, сагнаных з вокругу, ў палудні былі з'арганізаваны мітынгі, на якіх вытлумачывалася значэньне мабілізацыі.

„МАЛАЯ ВАЙНА“ У УСХ. БЕЛАРУСІ.

Парыжская эмігрантская расейская газэта „Возрожденіе“ (№ 829) зьмяшчае вельмі цікавую сводку дзейнасьці паўстанскіх атрадаў у Усх. Беларусі за некалькі дзён (ад 5 ліпня да 10 жніўня), з якой відаць, што на ўсім тэрэні Усх. Беларусі ідзе запраўдная „малая вайна“ з бальшавіцкаю уладаю Вось гэта сводка:

5 — 8 ліпня. Каля Крайска трапіў у воўчую яму аўтамабіль з чэкістамі. 3-х дзенная перастрэлка з высланым з Менска конным атрадам Г. П. У. Паўстанцы без стратаў адбіваюць атаку чырвоных і адступаюць у лясы Барысаўскага павета.

10 ліпня. Няудачная спроба звольніць з Барысаўскага Г. П. У. пленных „братоў“: падпалкоўніка М. Седлецкага, Л. Руткоўскага і М. Сяргеева. 12 пленнікаў растрэляны на дварэ Г. П. У. пасьля цяжкіх катаваньняў, 15 ліпня тры чэкісты былі захоплены атрадам недалека ад Барысава і павешаны з падпісам — кім і за што.

17 ліпня. Разгром атрадам атамана Кліма атрада Слуцкага Г. П. У. Камандзір чэкістаў Грунбэрг павешан.

18 ліпня. Разгром зьвянігароцкага Г.П.У. Замардавана 25 чэкістаў і камуністаў. З боку паўстанцаў 3 забітых і 8 раненых.

22 ліпня. Разгром пры в. Куповічы чырвонага карацельнага атрада Пакінуў 10 чал. забітымі, чырвоныя разьбягліся, пакідаўшы ружжы. Сярод паўстанцаў два лёгка ранены.

24 ліпня. Камандзірованымі дабравольцамі з „братоў“ узарваны ў Петраградзе гмах партыйнага клюбу камуністычнай партыі. Згінула 100 камуністаў.

1 жніўня. Начны напад атамана Кліма на м. Койданаў. Разаружаны чырвоны гарнізон (бат. 39 пях. палку), захоплена ўсё аружжа і баявыя запасы. Палітычны кіраўнік бат. Каралаў і яго заступнік растрэляны Старшыня Г. П. У. Зэйдовіч схаваўся.

2 жніўня. У Менску непарадкі работнікаў на шкляным заводзе „Кастрычнік“. Замардаваны чэкісты Манастырскі, Столаў і Сонцаў. У Ждановічах спаляны гмах „Комхоза“.

3 жніўня. У Менску спаляны гмах „соўнархоза“. Менская Г. П. У. выслала моцныя атрады ў раёны м. Ігумена і ўдоўжкі Бярэзіны проці тамашніх паўстанцаў. Бой каля Будзіслаўля. Чырвоныя згубілі 11 забітых і шмат раненых. Паўстанцы адыйшлі без стратаў.

4 жніўня. 2-х гадзінны бой ў раёне Баранавічаў з 2-мя атрадамі Г. П. У. Адабрана ад чырвоных 2 кулямёты і 30 вінтовак. Страты паўстанцаў: 2 забітых і 16 раненых. Каля в. Грэбенца доўгая перастрэлка з чырвонаю пагранічнаю стражаю. Страты аднолькавыя: у паўстанцаў — 3 забітых і 8 ран., у чырвоных — 3 заб. і 18 ран.

5 жніўня. Каля в Стасовічы блізка граніцы бой з чырвоным кавалерыйскім палком пры 2 гарматах. Перастрэлка цягнулася ўсю ноч. Раніцаю паўстанцы, узяўшы з сабою 3 ран., адступілі у глыбіну савецкай тэрыторыі. Чырвоныя згубілі 40 чал. забітымі раненымі. Налёт атамана Кліма на м. Барысаў. Разгром савецкіх спажывецкіх складніцаў. Прадукты разданы насяленьню. Міліцыя і чэкісты пахаваліся.

6 жніўня. Гэткі-ж самы налёт атамана Фіманава на м. Слуцк. Забіты тры паўстанцы.

7 — 9 жніўня. Рад пасьпешых экспэдыцыяў паўстанцаў у раёнах в. Вялікія Мервіны, пагранічнага паста Басманы і мястэчка Івецск. Напад на Беркоўшчыну.

10 жніўня. Каля Семкава Гарадка зьбіты чырвоны разьведачны аэраплян...

З Менска паведамляюць, што антыбальшавіцкі паўстанчаскі рух пасьля кароткага

Воук на псарні.

(*З баек Крылова*).

Воўк, лезучы ў аўчарню,
Заблутаўся й папаў на псарню.
Пачуўшы шэрага дух блізка забіякі,
Падняли гвалт усе сабакі.
З ланцугаў аж ірвуцца,
У бой з ваўком уступіць імкнуцца.
Прачхнуліся псары і крык узьняўся,
Уставай браты!
Тут злодзей да нас забраўся!
Крычаць: адзін:—агня давай!
Другі — вароты зачыняй!
Словам пеклам стаўся двор.
Бягуць, схапіўшы хто тапор,
Хто кол, а іншы і ружжо.
Воўк, бачучы, што ўжо
З ім кепска справа — закруціўся,
У куток забіўся,
Зубамі ляскае, паставіў дыбам шэрсьць,
Здаецца: вось гатоў усіх з'есьць...
Навокал лыпае вачыма, —
Уцечка, бачыць, немагчыма!
Зусім прыйшоў яму канец!
Прыдзецца тутка за авец,
За ўсе зладзействы здаць рахунак...
Шукаючы якійсь ратунак —
Уступае воўк у перагаворы.
І кажа: што ў вас за шум?
Сябры! Я-ж ваш здаўна ўжо сват і кум,
Прыйшоў да вас цяпер мірыцца.
Даволі нам ужо сварыцца!
Забудзем прошласьць, зробім згоду,
Я прыкрасьцяў ужо народу
Рабіць ня буду, ў тым клянуся!
На'т болей: я за вас бяруся
З другімі на сьмерць ваяваць,
Ад усіх ваўкоў абараняць. —
І воўчай клятвай вам сьцьвярждаю,
Што я... — Перапрашаю!
Тут лоўчы спыніў ваўка мову:
Я ужо стары і ваўка с пову
На колькі верыць добра знаю!
Дзеля таго вось звычай маю:
Заместа ўсякай міравой —
З ваўкамі гутарыць, садраўшы скуру з іх далой!

——..——

Сказаўшы так
Лоўчы на ваўка выпусьціў сваіх сабак.

Б. Друцкі.



ВОЎК НА ПСАРНІ.

У ЧЫРВОНЫМ ПЕКЛЕ.

ЗЬНІШЧЭНЬНЕ ЛЯСОЎ.

Радавыя улады вельмі устрывожаны няспыняючымся зьмяншэньнем плошчы лясоў на Украіне. Лес бязлітасна нішчыцца сялянамі. У 1914 г. на Украіне было 4,869,000 дзесяцін лесу, ў 1924 г. — 4,080,000 дзесяцін, а ў бягучым годзе засталася толькі 3,431,000 дз.

Пракурор скончыў, уся заля быццам замёрла.

— Вось праўда! Зладзей гэты павінен згніць у турме! мільганула не адна думка..

Але вось падняўся адвакат—красамоўца. Заля ізноў застыгла. Усе голавы з быццам яўна настарожанымі вушамі пацягнуліся у бок століка абаронцы

Ен нахіліўся да абвінавачанага і шапнуў яму: — Радуйся! Слухай мяне, апраўдаю! Пасьля так-жа стрыгануў вачыма па салі, па судзьдзях. Застанавіўся на пракурору і пачаў:

Я быў бы шчасьлівы, каб мог здаволіць свае сумленьне тым, чым здаваляецца сумленьне пракурора. Відаць мундзер афіцыяльнага абвініцеля іншыя шляхі вызначае праўдзе і справядлівасьці чымся скромная вопратка цывільнага чалавека Я чалавек; мае сумленьне ня можа так лёгка пагадзіцца з думкай, што вось той чалавек, які сядзіць перад намі — злодзей дый такі яшчэ страшэнны, што яго канешне трэба згнаіць у турме. Пан пракурор сам прызнаў, што доказаў проці абвінавачанага няма. На якой-жа падставе дамагаецца ёй кары яму дый яшчэ суровай? Я ведаю такжа лацінскае прыслоўе, з якім выяжджае пан пракурор. Але успомніце, паны, гісторыю. Успомніце голас народу, да якога вас адсылае пракурор, — у судзе на Хрыстусам. Тады народ сказаў Пілату: „распні яго!“ І ціж пан пракуратор прызнае, што тут голас народа быў голасам Бога?...

Па салі прабегла быццам электрычная іскра. Кабеты пачулі як да іх вочаў падкатваюцца сьлезы...

...Ці-ж Бог мог наказаць праз вусны Народу сьмерць свайму сыну? Не, паны! Голас Народу не павінен рашаць гэткія справы. Вашае сумленьне, голас вашае душы і сэрца, рэгуляваны практычнай ведай — вось хто павінен падсказаць вам прыгавор! Бойцеся пайсьці за злудай апініі масаў! Помніце, што натоўп бяз сэнсу можаісьці за першым парывам, за кінутым некім у час узбурэньня словам!

І зноў успомніце гісторыю Суда: колькі была прыкладаў абмылак, калі суд ішоў не за голасам фактаў, а за гэтым „Vox populi“?

Падумайце аб тым, што пагражае абвінавачанаму. Доўгіе гады жыцьця ў мурах, ўдалі ад таварышоў, сямьі.. Успомніце і скажыце: ці ўвесь цяжар гэтае кары можа ўраўнаважыць той „голос“ паліцыянтаў і выжыўшай з вума старухі, якіх інтэлект ня здольны ўсведаміць сабе, што значыць свабодалюбіваму чэлавеку, гэтаму твору на абраз і падабенства Божае — быць пазбаўленаму сьвету і радасьці свабоды?...

Адвакат зрабіў паўзу і напіўся валы. Цяпер ужо шмат хто ў салі шмыгаў носам ды паслугоўваўся хустачкай быццам каб абцёрці пот. На'т судзьзі ўсе пачалі нек старанна маніпуляваць хусткамі каля носу і акуляраў..

— Пракурор заве вас паслугоўвацца на вучным дасьледам. Узывае да ценяў Ламброзо і яго прынцыпаў і мерак... Паны Судзьзі! вы ведаеце з жыцьця, як часта мыляюцца тэорыі. Хто ведае, як павінны мы былі-б трактаваць, пана Пракурора, каб да яго датасавалі меркі Ламброзо?

Побач з гэтым мы ведаем, што не рысы твары, ці размер і форма галавы, але выраз вочаў, усяго твару — лепей усяго гавораць аб душы чалавека. Пагледзьце-ж на абвінавачанага, у яго вочы? Ці ў іх нявінным і шчырым блакіце вы знойдзеце хоць крапельку чагосьці, што сьведчыць аб яго здольнасьці на злачынства? Пракурор кажа: шмыгае вачыма! Цікава, асам-жа Пракуратар седзючы на сваім месцы ці-ж так ужо і не цікавіцца тым, што дзеіцца навокал яго і зможа доўга сядзець уцяўпіўшы вочы ў адно мейсца?

У залі ізноў прайшоўся нейкі ўздых. Усе, разам з судзьзямі ўставіліся на абвінавачанага, які заерзаў, зашмыгаў носам і пад напорам сотняў скіраваных на яго вочаў — закрыў іх рукамі...

Пабачце ж уважліва на абвінавачанага. Гэткі адкрыты шчыры твар, як і вочы, ня ўмеюць ілгаць Гэтыя вочы як у люстры адбіваюць чэснае сэрца, высокую, мо' прымітыўную думу, душу узрослага дзіцяці! Гэты чалавек ня можа ілгаць.Яго чыстая, чэсная душа не дапусьціць ілжы на'т калі-б гэтая ілжа суліла яму поўнае апраўданьне; Душа яго брыдзіцца ілжой. І калі-б на яго сумленьні было што небудзь, які небудзь грэх, яго душа, яго чыстае сэрца не папусьціла-б яго ілгаць! І гэткага чалавека п. Пракурор хоча згнаіць у турме! Не, паны! Я не магу дапусьціць гэтае мысьлі! Я веру што праўда, якая жыве ў душы гэтага чэснага чалавека сяньня пераможа і даб'ецца трыумфу!

Гэтую праўду вы паслышыце з вуснаў самога абвінавачанага У яго апошнім слове. Ен ня скрые нічога ад вас так, як ня скрываў да гэтуль...

Тут абвінавачаны не сьцярпеў: Хліпаючы падняўся ён і голасна на ўсю залю перабіў паток красамоўства свайго абаронцы:

Але, паныСудзьзі! Я — праўду.. сумленьне ў мяне... сэрца.. Каюся! Я ўсё зробіў тое, аб чым тут казалася... Краў, абманваў... Прашу апраўдаць за чыстасьць сэрца за шчырасьць...

———

Пасьля прыгавору, якім абвінавачаны быў пакараны доўгалетняй турмой — ён накінуўся на абаронцу:

А як жа: знайшоў аб чым казаць! Гад гэтакі! Я з дуру паверыў, разьнюніўся... Душа, сэрца! На, табе кукіш, а не гонорар брахун паганы! Пачакай: ня век буду сядзець! Я табе пакажу і вочы і душу і сэрца і што шчэ? Папамятуеш мяне чорт куртаты!!!

Б. Друцкі.

Тутэйшая хроніка.

— **З ЖЫЦЬЦЯ Т-ВА „ПРАСЬВЕТЫ:“** Пасьля адкрыцьця гурткоў т-ва „Прасьветы“ ў Літве і Палачанах у Літве распаўся гурток „Інстытуту Гаспадаркі і Культуры“, а ў Палачанах гурток „Т-ва Школы“. Радныя беларусы гміны запісаліся ў Т-ва „Прасьветы“.

— **З БЕЛАРУСКАГА ЖЫЦЬЦЯ.** Пасол сойму Сабалеўскі выйшоў з Грамады і разам з пасламі Шапелем і Шакуном, быўшымі сябрамі Niezależnej Partyi Chłopskej уступіў да беларускага клюбу.

— **З БЕЛАРУСКАГА ВЫДАВЕЦТВА.** Выйшла з друку кніжка „Кароткі Нарыс Гісторыі Беларусі“ У. Ігнатоўскага, выданьне IV., папраўленае, выдавецтва У. Знамяроўскага

— **НАРЭШЦЕ НЕШТА І ДОБРАЕ.** „Беларуская Крыніца“ спачатку абхаяўшы часопіс „Беларускую Культуру“ пасьля, знайшоўшы для сябе надта прыемны артыкул аб вуніі і апомніўшысь, што яшчэ мала „ляганула“ „Народныя Гоні“ — другім артыкулам „восьпяяла“ пахлебнаю песьню вышаўшаму першаму нумару „Беларускай Культуры“.

— **„ЗЬЕЗД ПА СЭКРЭТУ“.** З „Kur. Wil.“ (№ 215) даведаліся, што 18 г. м. адбыўся нейкі зьезд „Бел. Сял. Саюзу“ № 2. Я. Станкевіча — Спадара. Аб гэтым зьезьдзе ня было ніякіх вестак а ні ў воднай з беларускіх газэтаў, у гэтым ліку нават і ў газэтцы самага Спадара „Народ“, ініцыятара гэтага „зьезду па сэкрэту“. Чыя „рука“ кіравала гэтым зьездам і адкуль былі атрыманы грошы (і не малыя?!) на найм салі Крэйнгэля і на прыезд аж 53 асобаў, так сама нічога ня ведама. Крыху сьвету кідае на гэты зьезд „Сялянская Ніва“ (бо ей і карты ў рукі), якая ў № 68 называе гэты зьезд „Луцкевічаўскім зьездам“ Гэта зусім выразна стверджае сам Луцкевіч у „Нашай Праўдзе“, (№ 49), называючы яго „зьездам групы ідэйных сяброў Сял Саюзу“.

Гэта ўсе было-бы зусім ясна для ўсіх, калі б першая заметка аб гэтым „сэкрэтным зьезьдзе“ не паявілася ў польскай газэце „Kur Wil“, блізка стоячай да ўрадавых колаў, і каб сам Спадар Янка Станкевіч не плутаўся доўгі час перад гэтым зьездам у калідорах ваяводзтва???..

Цяпер зусім ня можна разабрацца: з чыягож „благаславенства“ рабіўся гэты „сэкрэтны зьезд“?..

— **РЭГІСТРАЦЫЯ.** У зьвязку з адбываючайся на цэлым тэрэні Рэспублікі рэгістрацыяй радзіўшыхся ў 1909 г. у віду частых непаразуменьняў ваенныя ўлады паведамляюць, што абавязковай рэгістрацыі падлягаюць усе мужчыны, радзіўшыхся ў 1909 г., сталыя жыхары Вільні, як роўным чынам пражываючыя ў Вільні і не маючыя фактычнага мейсца пражываньня ў краі, ці якіх сталае места пражываньня невядома. Абавязку рэгістрацыі не падлягаюць асобы ня польскага грамадзянства. Віноўныя ў ухіленьні ад рэгістрацыі падляжаць грашовай кары ў разьмеры 500 зл ці арэшту да 6 тыдняў, альбо таму і другому разам.

— **ДАБЫВАНЬНЕ ДАКУМЭНТАУ, ЗАСТАУШЫХСЯ Ў РАСЕІ.** Па пытаньню аб дабываньні асабістых дакумэнтаў ад рэдавых уладаў пры пасрэдніцтве польскіх кансулаў міністэрсва заграпічных справаў у паразуменьні з міністэрствам скарбу ўстанавілі наступную сыстэму дзейнасьці: асоба шукаючая свае дакумэнты, павінна выслаць да консульскага дэпартамэнту заграпічных справаў у Варшаве адпаведнае паданьне, аплачанае звычайным гэрбавым зборам. Міністэрсва загран. справаў установіць на падставе гэтага паданьня высату аплаты, патрэбную для пакрыцьця выдаткаў, звязаных з дабываньнем дакумэнтаў і вылічаных у далярах паводле таксы 3 даляры за кожны дакумэнт і вышле зацікаўленай асобе адпаведнае пасьвядчаньне. На падставе гэткага пасьведчаньня зацікаўленая асоба можа выслаць па пошце безпасрэдня адпаведнаму польскаму консулу ў Расеі вызначаны лік амэрыканскіх даляраў. У выпадку беднасьці зацікаўленая асоба павінна прылажыць да паданьня пасьведчаньне аб беднасьці, на падставе якога міністэрства заграпічных справаў можа дабыць дакумэнты безплатна.

— **ПАЗЬБА НА Ж.-Д. ТОРАХ.** На жалезна-дарожных торах часта можна заўважыць пазьбу кароў, коз і нават стадка. Гэта часта выклікала катастрофы. Дзеля гэтага міністэрства камунікацыі зьвярнулася да адміністрацыйных уладаў з прозьбаю аб выданьні адпаведных загадаў, маючых мэтаю узмацненьне нагляду і караньня ўласьнікаў стадку, выганянага на пазьбу на ж.-д. торы.

перарыву ў апошні час зноў ўзмацніўся. Атаман Клім, хаваўшыся некалькі тыдняў у лясох каля Слуцку, у працягу апошняга часу зноў зрабіў некалькі нападаў у Барысаўскім районе.

З МІЛЬЕНЫ НЕГРАМАТНЫХ у УСХ. БЕЛАРУСІ.

Статыстычны урад Усх. Беларусі падае жменю лічбаў аб насяленьні, пражываючым на тэрэні Усх. Беларусі, з якіх вынікае: З агульнага ліку 4.983,240 жыхароў Усх. Беларусі беларусы складаюць 4,017,301 чалавека, жыды — 407,059, расейцы — 383,806, палякі 97,498. З гэтага ліку беларусаў па беларуску размаўляюць 3,294,293, па расейску—708,620 і на іншых мовах — 10,494. З лічбы расейцаў—па расейску размаўляюць 376,335, па баларуску—6,632 і на іншых мовах — 402. З лічбы палякаў—па польскі размаўляюць—36,046, па беларуску — 42,751, па расейску—1,179 і на іншых мовах — 1,419. Жыды — па жыдоўску размаўляюць — 365,322, па расейску — 39,273 і па беларуску — 1,532. Агульны лік неграматных дасягае 2,942,259, з якіх беларусы складаюць 2,540,220 чал., расейцы 193,915, жыды — 125,208 і палякі—48,681. Раздзел насяленьня паводле карыстаньня моваю канкрэтна наступны: карыстаюцца беларускаю моваю — 3,350,797, расейскаю — 1,165,722, жыдоўскаю — 369,252 і польскаю — 42,186

ЖЫЦЬЦЕ ПРОВІНЦЫІ.

Горадня

3-га верасьня была распушчана мястовая рада. Цяпер не адзін жыхар места скажа што варта было-б па нашым пакойнічкам—радным адслужыць паніхіду, падзякаваўшы за ўсю іх працу. Няма ў месьце ні аднэй асобы, хто-бы не парадаваўся гэтаму здарэньню, бо кожны ўжо чакаў яго—і стары і малы, надта яны далісь усім ўзнакі і не аднаго абашлі сваёй ласкай. Самі радныя нават прызнавалі, што яны нікому ня прыносяць карысьці Яны ня раз выступалі з прапазыкай сваёй адстаўкі. Але паміж іх былі яшчэ і такія, каторыя прымазаліся да магістрату і вельмі не хацелося ім пакідаць свае наседжаныя, цёплыя крэслы за якія моцна трымаліся рукамі і зубамі. Але час прабіў: прыйшла пара ўступіць свае мейсца іншым, каторыя думаюць ня толькі аб сябе, але і не забываюць і другіх. Тэрмін новых выбараў вызначаны на 9 кастрычніка. Дык трэба падумаць аб тым, каб ён не захапіў нас непадгатаванымі. Аб гэтым трэба падумаць цяпер, не адкладываючы працы, бо мы заўсёды і ўсюду пазьнімся і на гэтым шмат трацім. Трэба нам аб'еднацца і правясьці да Рады сваіх прыхільнікаў, каторыя падтрымлівалі-бы і баранілі нашыя інтарэсы ў магістраце. Нас ёсьць шмат і мы маглі-бы шмат чаго дабіцца, калі-б трапілі да магістрату. Пара нам ачнуцца і заявіць, што мы зьяўляемся грамадзянамі сваей Бацькаўшчыны і маем правы на ўсё Добра было-бы, калі-б пачын у гэтым прыняў на сябе ногы ўрад тутэйшага беларускага таварыства дабрачыннасьці. У ліку сябраў гэтага камітэту знаходзяцца асобы добра ўсім вядомыя, каторыя маюць адносіны і да тутэйшай ўлады і зьяўляюцца прыхільнікамі яе. Вось, каб гэтыя асобы ўзяліся за работу аб'еднаньня беларусоў, дык тады і можна было-бы спадзевацца на добрыя дзеля нас рэзультаты выбараў да новай местовай рады. Будзем спадзевацца.

Горадзянін.

Пісьма у рэдакцыю.

Паважаны Пане Рэдактар!

Прашу зьмясьціць у Вашай паважанай газэце „Беларускае Слова“ маё пісьмо наступнага зьместу:

У № 62. „Сялянскай Нівы“ зьмешчаны закід на мяне за тое, што я выйшаў з арганізацыі „Сялянскага Саюзу“ і прылучыўся да Беларускай Нацыянальнай Партыі, каторая йдзе быццам разам з расейскімі „чарнасоценцамі“. Гэтым заяўляю, што тое, што пісала „Сель Ніва“ на п. Паўлюкевіча і на Бел. Нац. Раду, ўсё гэта як раз правоцзіцца „Сел. Саюзам“ бо ў часе выбараў самаўрадаў не п. Паўлюкевіч пайшоў на запятках расейскіх манархістаў, а Ярэміч. Далей піша, „Сель-Ніва“, што зганьбіў я сабе прадажнасьцяй. Гэта так сама няпраўда. Я нераканаў я, што „Сель.-Саюз“ уплыву ў сялянстве ня мае і што стаіць не за нашы інтарэсы, а толькі свае асабістыя. Дзеля гэтага я і выйшаў з „Сель.-Саюзу“ і прылучыўся да Б Н П., каторая бароніць нас А тое, што з вёскі Літвы пісаў у сваім пісьме Я Карташэвіч, дык так сама ўсё брахня бо калі ў сакавіку г. г. быў з'арганізаваны гурток „Сель.-Саюзу“, то гэта я вызначыў Я. Карташэвіча скарбнікам і маю і цяпер яшчэ запоўняную ягонаю анкету, нарэшце заяўляю „Сель.-Ніве“, што ніколі ілжу пісаць ня трэба і вашых гурткоў у Маладэчанскім павеце як німа, так і не з'арганізуе ніякі Карташэвіч, бо сялянам абрыдла глядзець на яго і на тое, што ён робіць.

З пашанай

А. Гордзей.

4 IX-1927 г

Паважаны Пане Рэдактар!

Прашу зьмясьціць у Вашай паважанай газэце некалькі слоў аб тым, як у нас у Горадні ашуківаюць жыды латвавэрных людзей.

У пачатку гэнага году прыехаў да мяне жыдок з Новага-Двара, Сакольскага павету, Давід Гольдшмідт і запрапанаваў мне купіць частку зямлі з маёнтку „Тальке“, належачага да абшарніка Матушынскага. Ведаючы п. Матушынскага з боку нядобрага, я адмовіўся купіць гэную зямлю, але праз некалькі дзён з'явіўся да мяне горадзенскі жыдок Борух Закгэйм з тым самым, гаворачы, што ён Закгэйм, усё можа зрабіць і пры яго помачы я куплю самую лепшую частку зямлі з маёнтку „Тальке“ і ён, Закгэйм перасьцярэгае мяне ад крудельства п. Матушынскага, на каторае ён вельмі спрытны. Ня мог я непаверыць жыду Закчэйму, бо ён мае разам з братамі ў Горадні банкірскую кантору, і мы пайшлі да абшарніка п Матушынскага, каторага знайшлі ў бюро парцэляцыйным п. Раманоўскага, дзе і сталі абгаварываць справу куплі 35 гэктараў зямлі з маёнтку „Тальке“. Пазнаёміўшыся з плянамі гэнай зямлі я запрапанаваў п. Матушынскаму за 35 гэктараў 2,000 даляраў, гэта значыць-каля 60 дал. за гэктар, але п. Матушынскі за гэту цану мне не захацеў прадаць і мы разышліся

Праз пару тыдняў да мяне прыйшоў ізноў Новадворскі жыдок Гольдшмідт і кажа, што п. Матушынскі ўжо хоча прадаць мне тую зямлю, якую я хацеў купіць за 2,000 дал., і я з жыдком Гольдшмідам пайшоў да п Матушынскага ў Эўрапэйскі готэль але як раз каля готэлю спаткалі жыдка Боруха Закчэйма каторы сказаў, што ўжо за позна, бо п. Матушынск гэную зямлю прадаў другой асобе. Але, калі я надта хачу купіць гэны абшар, дык абязкова мушу вярнуць той асобе задатковыя грошы, — словам ад мяне хацелі адтрымаць, як гарантыю куплі — 200 дал. Тады я зьвярнуўся да жыдка Боруха Закгэйма і папрасіў яго ўзяць „за рукі“, як гэта практыкуецца ў гандлёвых колах, 200 дал., з тым, што я не адмаўляюся купіць тую зямлю, за каторую даваў 2,000 дал. Борух Закгэйм вельмі ахвотна ўзяў гэныя грошы і абяцаў, што калі наша ўмова ня дойдзе да канца, дык ён зьверне мне гэныя грошы і ні ў якім выпадку не дапусьціць да страты. Але праз нейкі час, калі трэба было рабіць запрадажную, я даведаўся, што мне хочуць прадаць не тую зямлю, каторую я таргаваў, а зусім другую горшую, тады я запатрэбаваў ад Боруха Закчэйма назад 200 дал., але спрытны жыд грошаў мне не хацеў аддаць, і толькі, калі я падняў крык пры жыдох, знаходзячыхся ў канторы (мусіць яму, як банк'ру, вельмі брыдка стала), дык толькі тады Закгэйм зьвярнуў мне 175 дал., а рэшта 25 дал аставіў сабе „з а с в а ю п р а ц у“??

Дык вось, як ашуківаюць нас жыды, ня толькі дробныя гандляры, але нават і багачы банкіры.

Справу гэную скіроўваю да суду за ашуканства.

Язэп Валюк.

Юрыдычныя парады.

Сялянам в. Крапіўнікі. Запытаньне Вёска нашая мае сэрвітут на 60 дзес. Сучасны ўласьнік хвальварку, да яго належыць гэты сэрвітут, падаў Земскаму Камісару просьбу аб прымусовай ліквідацыі сэрвітуту. Колькі мы атрымаем зямлі за свой сэрвітут?

Адказ: Згодна з абавязуючымі законамі аб ліквідацыі сэрвітуту, Вам будзе аддана на ўласнасьць $1/3$ часьць сэрвітутнага абшару г. зн. 20 дз

Падп. Я. Г-ку. Запытаньне: Гадоў ужо амаль ня 20 як я пайшоў у прымы да ўдавы з малалетнімі дзяцьмі. Дзеці гэтыя перамерлі ў часе бежанства, бо ўся наша вёска ў 15 г. была выселена прымусова, як уваходзячая ў раён фронту. Вярнуліся мы дамоў у 1920 годзе. Але з гэтай пары да нас пачалі чапіцца браты першага мужа маёй жонкі і стараюцца адабраць ад нас зямлю, кажучы, што пасьля іх брата насьледнікаў няма, а дзеля гэтага, зямля мусіць перайсьці да іх. Да гэтай пары яны толькі стараліся запужаць нас пагрозай Суду і радзілі нам лепей дабраволена ўступіць ім зямлю. Цяперака ўжо яны падалі нас у Суд. Аднак і цяперака яны прапануюць зьмірыцца, або аддаць справу на рашэньне трацэйскага суду. Ці можна гэткім судом рашыць гэтую справу, як робіцца гэта і якія нашыя з жонкай правы на зямлю яе першага мужа? Зямлі ўсяго $8^{1/2}$ дзес., ды правы на сэрвітут і агульную пашу. І ці мы ня маем права на гэтую гаспадарку па даўнасьці?.

Адказ: Па закону Вашая жонка мае права на „ўказную долю“ г. зн, $1/7$ маемасьці мужа. Гэта на ўласнасьць. Апрача таго — яна згодна, з арт 1141 т. X. ч. 1. Закон. Цывільных — яна можа да сьмерці уладаць усім вучасткам, які дастаўся пасьля сьмерці яе дзяцей. Ніякіх правоў па даўнасьці вы не маеце, бо даўнасьці няма, калі ёсьць малалетнія ўласьнікі, а пасьля іх сьмерці вы яшчэ 10 гадоў не ўладалі. Справу гэтую можна аддаць рашэньню палюбоўнага (трэцейскага) Суда. Рашэньне гэтага суда, пры захаваньні ўсіх патрэбных фармальнасьцяў мае такую-жа сілу як і рашэньне Суда Кароннага. Пры гэтым Судовая справа спыняецца. Для таго, каб палюбоўны (трэцейскі) Суд адбыўся фармальна трэба: ў натарыуса або ў Судзьзі Міравога зрабіць гэтак званую „трэцейскую запісь“. У ёй павінна быць абазначана: якую справу і аб чым мае рашыць палюбоўны суд, калі, каго вывыбіраеце Судзьдзямі (трэба 3) калі і дзе Суд мае сабрацца для разгляду справы. Запісь гэтую трэба падпісаць як тым, якія судзяцца, так і абабранымі Судзьдзямі, канешна ў прысутнасьці Натарыуса ці Судзьдзі, словам дзе робіцца запісь.

Затым у вызначаны на запісі дзень і месцы Суд зьбіраецца, апрашываець стораны, сьведкаў, разглядае дакумэнты, калі ёсьць якія і па сумленьню свайму пастанаўляе рашэньне. Рашэньне пішуцца прыблізка на такой-жа форме, як і рашэньне Кароннага Суда. Пасьля пастанаўленьня рашэньня Палюбоўны Суд прадстаўляе ўсе дзелаводзтва свае да Кароннага Суда (па Вашай справе да Судзьзі Міравога Вашай акругі). Справа там ляжыць мясяць часу, а пасьля гэтага — старана, якая выіграла справу — атрымлівае выканаўчы ліст Пры пераходзе маемасьці ад аднэй асобы да другой — Судзьдзя прасылае рашэньне Палюбоўнага Суда да „Izby Skarbowej“ для аблічэньня і спагнаньня крэпастных налогаў.

Рашэньне Палюбоўнага Суда можа быць напісана, як і ўсе дзелаводзтва згодна з языковымі законамі з 1924 г. на беларускай мове.

Палюбоўныя судзьзі пастанаўляюць свае рашэньні толькі згодна з сваім сумленьнем. Яны не зьвязаны ніякімі абавязкамі перад фармальным цывільным (грамадзянскім) правам.

Рашэньні Палюбоўнага Суда аканчальныя і абжалаваньню не падлягаюць.

Паштовая скрынка.

Ванслав Эдвард—2 зл. атрымалі, газ. высылаем Я. Мароз, Ул. Брыш, Б. Несын, Анна Селястовіч, А. Абабурко, Я. Полухюсік, Ан. Альшэўскі Ал. Францішчык, Саўка Міхась, К Мароз, Галь Кіслы, П. Ракоўскі — пробныя нумары высылаем, прысылайце як найхутчэй падпісныя грошы.

М. ЗОШЧЭНКА.

З САВЕЦКАГА БЫТА.

КАТАРГА.

Сапраўдная катарга цяперака мець вэласіпэд

Праўда, ад іх вялікае здаволеньне, фізычная прыемнасьць і усе іншае. Ізноў-жа на сабаку можна наехаць, альбо курчанё запужаць.

Але, не бачучы на гэта, я адмаўляюся ад вэласыпэда. Я цяжка захварэў праз гэтую сваю машыну, праз гэты свой апарат.

Я падарваўся. І цяперака лячуся амбулатарна: жыла у мяне адкрылася. Гэтак кажучы інвалід я. Уласная машына мяне з'ела!

Запраўды, такое палажэньне: м шыну без сябе нельга на хвіліну пакінуць — сапруць. Ну, дзеля гэтага прыходзіцца машыну у вольны ад язды час цягнуць на сабе. На плячох·

Бывала зойдзеш у магазын, машыну нясеш. публіку па кутках разгоніш, бо коламі машыны чапляеш за голавы, плечы. Альбо да знаёмых на розныя паверхі падымаешся. Па справам. Альбо да крэўных.

Ды і у крэўных седзючы, рукой за кіраўніцу трымаешся. Ці мала які настрой зьявіцца у гэтага самага крэўнага? я-ж ня ведаю. У чужую асабістасьць ня улезеш. Задняе кола адымуць, альбо унутраную шыну выдзяруць. А потым скажуць: так-жа і было.

Наагул, цяжка прыходзілася.

Н я в е д а м а на'т хто на якім уласьціва езьдзіў: я на вэласыпэдзе ці ён на мне?

Канешна, даваенныя вэласыпэдыстыя пакідалі машыну на вуліцы. Замкне і пакіне. Але здаралася і тады: уганялі.

Вось і прыходзіцца лічыцца з умапаглядам усіх грамадзянаў. Прыходзіцца насіць машыну на сабе.

Канешна, чалавеку із здаровай псыхікай не надта вялікі цяжар нясьці на сабе машыну. Але для мяне абставіны злажыліся зусім неакуратна.

Патрэбны быў мне цалковы. На прапой душы, значца.

— Трэ', д у м а ю сабе, дзе н е б у д з ь стрэльнуць.

Добра што ёсьць машына: сеў дый пакаціў. Заехаў да аднаго прыяцеля: у хаце нямашака Ткнуўся на другога: у хаце ёсьць, але грошы у адсутнасьці.

А адзін хоць жыве толькі на 3 паверху, затое другі — ажно на 7-м... Зматаўся я туды — сюды, уверх — уніз з машынай на плячох — язык высалапіў.

Пасьля гэтага паехаў да крэўнай. На Сібірскую вуліцу. Да роднай цёткі. А яна прынада, на 6 паверху жыве.

Узьлез са сваім апаратам на 6 паверх. Бачу: на дзьвярох запіска Моў: за поўгадзіны прыйду.

— Шлындаецца, думаю старая качарышка.

Страшэнна я растроіўся, дый згарача узяў і зыйшоў на ніз. Мне-б' з машынай навярху зачакаць, а я зыйшоў, ад растройства, значца. Пачаў унізе чакаць цётку.

Хутка прыходзіць і яна дый абіжаецца дзеля чаго я з ёю наверх да яе кватэры ісьці не хачу.

— У м я н е, к а ж а, — з сабой толькі грыўна. Рэшта грошаў на кватэры.

Узяў я машыну на плечы, іду за цёткай. І чую: пачынаю ікаць, а язык вон із рота выпірае... Аднак дайшоў. Грошы атрымаў поўнасьцяй. Падкрапіў крыху арганізм: цётка угасьціла. Падправіў шыну, іду уніз

Толькі зыйшоў — бач — парадны уход закрыты. У іх а 7 гадзіне зачыняюць.

Нічога я тагды не сказаў, толькі зубамі страшэнна заскрыгатаў. Узьдзеў ізноў вэласіпэд на плечы, пачаў уверх падымацца, да цёткі.

Колькі часу падымаўся — не памятую. Йшоў, можна сказаць быццам праз сон.

Цётка па чорнаму ходу спушчае мяне, а сама падлюга, сьмяецца:

— Ты'б, кажа, машыну навярху пакідаў, калі баіся пакінуць на нізе

Пасьля спыніла свае сьмешкі: бачыць страшэнная бледнасьць па твару майму пайшла. А я і запраўды — трымаюся за кіраўніцу дый віхляюся на бакі...

Аднак выйшаў на вуліцу. Але ехаць ад слабасьці ня мог. І вось цяпер сказаліся вынікі: хварэю праз гэтую катаргу.

Цешуся толькі тым, што мотоцыклістам яшчэ горай. Вось, думаю, перажываюць!

І добра яшчэ, што у нас амэрыканскіх „небаскробаў“ ня удумалі будаваць. Колькі-б тады народу згібла!...

Пераклаў Б. Д.

Адказны Рэдактар Т. Вернікоўскі. Друк. І. Баеўскага Вільня, Мстовая 9. Выдавец Беларуская Нацыянальная Рада.